

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 6 (161) 5 САКАВІКА 1991 ГОДА


# ВІНШУЕМ СА СВЯТАМ!

## *ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР*

*Штогод, рыхтуючыся павіншаваць нашых цудоўных жанчын з першым вясеннім святам, лаўлю сябе на думцы, што, мабыць, і цяпер, як і раней, нагаворыш ім шмат традыцыйных агульнапрынятых слоў ... і ўжо каторы раз не скажаш самага галоўнага і самага важнага. І тут жа падумаеш: а ці магчыма гэта наогул!? Кожная жанчына — гэта асаблівы, нікому невядомы свет, і зразумець яго можа не кожны. Але ж у надзеях нашых сённяшніх жанчын і тое, чаго не хапае ўсяму нашаму нездароваму грамадству: мір, спакой, дабрабыт, здароўе і шчасце іх саміх, а таксама іх блізкіх і родных.*

*Дык няхай жа пажаданне ўсяго сказанага, а таксама надзеі на крышку свайго патаемнага, збудуцца і знойдуць водгук у чуткім і спагадлівым на добрае слова жаночым сэрцы.*

*Няхай жа жаночыя вочы заўсёды выпраменьваюць шчасце і надзею!*

*Дзеля гэтага варта жыць!*

*Са святам, дарагія жанчыны!*

**В. ЧАРАПІЦА.**

*Дзень 8 Сакавіка адзначаецца ў нашай краіне як афіцыйнае свята, але ў свядомасці людзей яно ў большай ступені асацыіруецца з днём паклanення перад Прыгажосцю і Веліччу жанчыны. Адзначаючы гэты дзень, мы захапляемся яе працалюбствам, цярплівасцю, маральнай чысцінёй. Усё гэта дазваляе зразумець, з якім вялікім задавальненнем я карыстаюся магчымасцю павіншаваць усіх жанчын універсітэта са святам 8 Сакавіка, Днём Вясны, а значыцца, з Днём Кахання і Надзей.*

*С. ГАБРУСЕВІЧ, прарэктар па вучэбнай рабоце.*

*Калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта сардэчна віншуе загадчыка кафедры прыкладной оптыкі прафесара СПОРНІКА МІКАЛАЯ МАКСІМАВІЧА з 50-годдзем і жадае яму моцнага здароў'я і далейшых творчых поспехаў.*



**ИГОРЬ ЗАВЬЯЛОВ**

Я в метель душевного заснежья
Закружу твой дом, что весь в огнях,
И в окошко ледяное нежно
Стану петь, снежинками звеня.

Бледный месяц обрамлю я в тучи,
Может, в грусти обернешься ты
Подсмотреть, как за окном сыпучий
Заметает снег твои следы.

Ты послушай, может быть услышишь,
Бросив праздник, тихий голос мой.
Я струиться снегом буду с крыши
Над твоею светлой головой .

Это я в душевное заснежье
Закружил твой дом, что весь в огнях,
Чтоб в окошко ледяное нежно
Петь и петь, снежинками звеня.

## ПЫТАННЕ— АДКАЗ

***— ЯКОЙ ВЫ УЯЎЛЯЕЦЕ САБЕ ЖАНЧЫНУ 8 САКАВІКА?***

*— Добрай, прыгожай — такой, якой яна не бывае ў паўсядзённым жыцці.*

***

*— Шчырай і ласкавай, а галоўнае, каб у гэты дзень, хоць адзін дзень у год, яна не крычала на мяне, не казала, што я ёй ні ў чым не дапамагаю!*

***

***— ЯКІЯ СЛОВЫ ВЫ СКАЗАЛІ Б ЁЙ У ГЭТЫ ДЗЕНЬ?***

*— Я сказаў бы: «Сёння я зраблю для цябе ўсё, таму будзь такой, як сёння ў хатніх клопатах, толькі раз у год, на 8 Сакавіка.*

***

*— Няхай для ўсіх жанчын перабудова не канчаецца прэзідэнцкімі ўказамі...*

***

***— КАЛІ Б ВЫ ВАЛОДАЛІ Ў ГЭТЫ ДЗЕНЬ НЕЗВЫЧАЙНЫМІ МАГЧЫМАСЦЯМІ, ЯК БЫ ВЫ ІХ СКАРЫСТАЛІ?***

*— Самай прыгожай, добрай прапанаваў бы стаць маёй жонкай, а ўсіх астатніх людзей зрабіў бы добрымі, здаровымі, шчаслівымі.*

***

***ЯКІМ ВЫ ЎЯЎЛЯЕЦЕ САБЕ МУЖЧЫНУ Ў ДЗЕНЬ 8 САКАВІКА?***

*— Мужчына ў дзень 8 Сакавіка — гэта поўнае супрацьпастаўленне самому сабе ва ўсе астатнія дні года.*

***

*— Уяўляю: стаіць ён на кухні з закасанымі рукавамі і гатуе вячэру.*

***

***ЧАГО ВЫ ЧАКАЕЦЕ ДЛЯ СЯБЕ У ГЭТЫ ДЗЕНЬ?***

*— Я чакаю сонечнай пагоды на вуліцы, усмешак, якія робяць людзей дабрэйшымі. Чакаю таксама віншаванняў і цёплых слоў.*

***

*— Добрага настрою, хочацца быць самай шчаслівай на зямлі!*

***

***КАЛІ Б У ГЭТЫ ДЗЕНЬ ВЫ МАГЛІ Б РАБІЦЬ ЦУДЫ, ТО ШТО ЗМЯНІЛАСЯ Б У СВЕЦЕ?***

*— Я спыніла б усе войны, каб людзі жылі ў міры і згодзе, каб больш ніколі не ліліся слёзы і кроў.*

***

*— Хацела б зрабіць падарункі сваім родным і сябрам.*

*— Каб я ўсё магла, то, у першую чаргу, запоўніла б магазіны таварамі, каб нашы жанчыны сустракалі свята з нейкім заміраннем у сэрцы, з чаканнем цуду, а не штурхаліся б па магазінах і не думалі б, што дзе ўзяць да святочнага стала.*

# МИССИЯ ЖЕНЩИНЫ

**«Истинно, Мы чтим великое Женское Начало, Мы чтим начало дающее, которое дает жизнь Красоты и Сердца».**
**(Из книг «Живой Этики»)**

...В культуре красоты будущего особенно великая роль будет принадлежать женщине. В ее руках уже теперь священный огонь домашнего очага; украсить, наполнить повседневную жизнь гармонией прекрасного — ее задача. Но ее существенная миссия несравненно больше: духовная красота женщины, как невидимые лучи, проникает в вибрации души ее мужа и детей, дает им благие импульсы, вовлекает в светлый, энергетический ритм. Но значение духозарной женщины выходит далеко за пределы семьи. Мудрым светом своего сердца, сердца, постигшего и следующего высшему Закону Гармонии Вселенной, светом своего чувствознания она претворяет все окружающее и, сама еще будучи на пути высшего развития, она претворит и сознание человеческое, дав ему новые цвета и тона. Ведь миссией женщины и до сих пор было: сеять огонь духа, вдохновлять и возвышать мужчину, зажигать пламя мужества, энтузиазма, геройства, любить и жертвовать собою. Если мужчина часто служит уничтожающей силе, женщина рождает жизнь, она — носящая жизнь, благославляющая жизнь, великая творящая и очищающая мир. Главное — женщине-матери дана первородная власть над душой ребенка. Лишь через прекрасный огонь ее сердца дитя может войти в царство грядущей красоты.

Если бы каждая женщина-мать осознала всю свою безмерную ответственность. Если бы она очистила, украсила и приготовила свое тело и дух, как нерукотворный храм для неземного своего гостя, для пришельца с дальних сфер. Если бы она возжелала стать истинно достойной нести чудо из чудес под своим сердцем, искренне стремясь самой стать прекрасной. Она должна походить на Марию в восточной легенде, которая поет своему ребенку колыбельную песнь, в могучей вере своего сердца: «Пусть люди считают тебя пахарем, но я знаю, сынок, что ты — царь!»

Именно, каждая мать должна задаваться целью: я хочу родить Царя Духа, носителя высшей Красоты на земле. Призыв матери должен быть поистине цельным и освященным любовью, он должен исходить из самых пламенных глубин ее жажды самосовершенствования и общего блага, тогда он и получит достойный ответ. Если бы сердца всех матерей объединились в молитве Наивысшему, то как мир несказанно преобразился, претворился бы через сознание их детей — будущих членов общины мира!

Женщине предоставлена и космическая задача, которую она должна вполне осознать: а именно — трансмутировать низшую, грубую природу человечества в высшую, светозарную, уготовить путь также оболочке дальнего путника Вселенной, утончить и одухотворить его тело, воспитать прекраснозвучащей его душу, огненно возвысить его дух. Так женщина, чуткой мудростью своего сердца, будет способна, истинно, продвигать вперед мир!

Поэтому в перспективе будущего звучат слова латышского поэта Райниса:

«Вся красота жизни идет от женщины,
Без нее мы не смогли бы перенести тягости жизни, —
Вся любовь жизни идет от женщины,
Без нее мы жили бы в темноте и ненависти...
Из сердца женщины исходит светлая, нежная мощь
И не угаснет во времени, пока не победит.»

И победа женщины настанет, когда снова установится потерянное равновесие между обоими началами, когда женщина станет свободной и общественно, и духовно, когда женщина сможет стать на священном дозоре в будущем Храме красоты жизни, когда любвеобильное сердце женщины и творческое действие мужчины объединятся в высшей красоте содружества и строения, и когда мужчина и женщина, в совместном гармоническом творчестве, преобразят нашу планету.

РИХАРД РУДЗИТИС.

# ЖАНСАВЕТ ЗАПРАШАЕ СЯБРОЎ

Ужо трэці год працуе наш жаночы савет. Працуе нераўнамерна, так, як праходзіць зараз наша жыццё,— то ўсплескі актыўнасці, то перыяд зацішша, а то і адчаю, калі рукі апускаюцца і нічога ўжо не цікавіць.

У перыяд, калі ішлі дыскусіі, ці патрэбны жансаветы, калі шматлікія штучна створаныя жаночыя арганізацыі хутка перасталі існаваць, гэта пытанне стаяла і перад нашым жансаветам. І тады былі знойдзены такія формы работы, якія ўсіх задавальнялі — вечарыны знаёмстваў з навінкамі моды, сустрэчы з псіхолагам, гурток кройкі, улік і падтрымка шматсямейных. І, канечне, усе гэтыя формы адыйшлі на задні план перад жорсткай рэальнасцю сённяшняга дня — праблемамі выжывання, праблемамі эканамічнымі. Жаночы савет імкнуўся дапамагчы жанчынам неяк выстаяць. Старшыня жансавета ўвайшла ў састаў прафкома, узначаліла ў ім камісію па арганізацыі гандлю. Мы змаглі арганізаваць продаж дэфіцытных рэчаў у нашым універсітэце. Але і гэты этап нашай дзейнасці завяршаецца.

І вось, гледзячы ў будучыню, нам бачыцца шэраг пытанняў, якія ў стане вырашыць жансавет. У першую чаргу, гэта каардынацыя намаганняў жанчын па паляпшэнню ўмоў працы і быту. Клопат аб састарэлых, дапамога сем'ям, якія маюць шмат дзяцей, арганізацыя продажу і абмену дзіцячых непатрэбных рэчаў, арганізацыя дзіцячых і сямейных святаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў — вось асноўныя накірункі нашай будучай работы. У склад жансавета ўваходзяць жанчыны, якія карыстаюцца аўтарытэтам у сваіх калектывах. Жаночы савет чакае не дапамогі, не, але просьб і зваротаў тых, каму патрэбна наша падтрымка, клопат і дапамога. Мы чакаем цікавых прапаноў па рабоце нашага савета, што яшчэ трэба зрабіць, каб жыццё нашых жанчын было б хоць крыху лягчэйшым.

Ад усёй душы жансавет віншуе ўсіх жанчын універсітэта з надыходзячым святам 8 Сакавіка і жадае не губляць бадзёрасці і аптымізму ні пры якіх умовах.

**Т. А. БАДЗЮКОВА,**
**старшыня жансавета універсітэта, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

# НА ЭКРАНАХ ГОРАДА

З 7 па 17 сакавіка ў кінатэатрах «Гродна» і «Кастрычнік» будзе дэманстравацца цудоўная карціна Галівуда, удастоеная дзесяці «Оскараў»—**«Панесеныя ветрам»**. Фільм зняты па аднаіменнаму раману Маргарэт Мітчэл рэжысёрам Віктарам Флемінгам.

На фоне гістарычных падзей грамадзянскай вайны ў Амерыцы—паміж Поўднем і Поўначчу—разыгрываецца захапляючая драма кахання і рэўнасці, высакароднасці і нізасці, адчаю і мужнасці. Гераіня гэтай драмы— самая прыгожая дзяўчына Атланты Скарлет О'Харра—ганаровая, капрызная і незалежная. Лёс Скарлет, напоўнены вялікімі пакутамі, выклікае захапленне і здзіўленне. У галоўнай ролі — вядомая англійская актрыса Вів'ен Лі («Мост Ватэрлоо», «Ледзі Гамільтон» і інш.). Ролю Рэта Бартлера выконвае славуты амерыканскі акцёр Кларк Гейбл, у 30-я гады ўдастоены «Караля Галівуда». Лёс фільма **«Панесеныя ветрам»** унікальны — створаная больш пяцідзесяці гадоў назад, стужка не сходзіць з экранаў амерыканскіх кінатэатраў. Даўно і добра вядомая ва ўсім свеце, яна прыйшла да нас толькі цяпер. Але класіка тым і прыцягвае, што яна неўміручая...

Падзеяй стане і польская стужка рэжысёра Кшыштофа Кесьлеўскага **«Кароткі фільм аб забойстве»**, удастоеная прыза «Фелікс» — вышэйшай узнагароды за лепшы фільм 1987 года, зняты на еўрапейскім кантыненце.

... Спачатку малады хлопец вельмі доўга на нашых вачах забівае таксіста, а затым дзяржава невыносна доўга забівае злачынца. Падымаючы пытанне аб маральным баку вышэйшай меры пакарання, Кесьлеўскі не шкадуе нерваў гледачоў, дабіваючыся катарсіса, як ачышчэння ад звыклых стэрэатыпаў непарушных ісцін. Ці вырашае ўзаконенае забойства чалавечыя праблемы? Ці становяцца ад гэтага чысцейшымі і справядлівейшымі ўсе людзі, якія змагаюцца за справядлівасць?..

Сенсацыяй месяца стане і супербаявік **«Зорныя войны»** — той самы славуты фільм Д. Лукаса, які можна назваць «вестэрнам у Космасе». Мы ўбачым, як магутная касмічная імперыя ўкрадзе Прынцэсу адной з планет, і на пошукі якой адправяцца доблесныя галактычныя рыцары.

На студыі «Фора-фільм» пастаўлена стужка А. Навумава **«10 гадоў без права перапіскі»**. Завязка яе нестандартная: папаўшы ў лапы юрлівага Берыі, маладая жанчына становіцца прычынай крывавай трагедыі.

Кінакамедыя **«Бабнік»** парадуе аматараў Аляксандра Шырвіндта, які выканаў ролю «абаяльнага і прывабнага» халасцяка, які калекцыяніруе прыгожых жанчын. Праблемы прыйдуць у яго хату разам з прыездам сына, які вырашыў пайсці па слядах свайго бацькі...

**«Пад паўночным ззяннем»** — савецка-японская стужка, якая вылучаецца здзіўляючымі здымкамі.

У лёс герояў уплятаецц гісторыя ваўка, які наводзіц страх на жыхароў снежных пра стораў Камчаткі. Аўтары карцін расказваюць аб воўчай згра якая вядзе жорсткую барацьб за існаванне, аб людзях, які супрацьпастаўляюць дабрыню адвагу закону сілы і нахабства.

**«Тапер»** — музычная стужк Рыжскага вытворчага аб'ядна ня аб лёсе і творчасці маладо кампазітара. Прататыпам геро стаў вядомы ўсім Раймонд П улс.

Іншыя фільмы мес ца —**«Анёлачак»** (ЗША) — пр сэксуальнага маньяка, які вяд паляванне на прастытутак, паліцыю, якая палюе на я **«Сям'я»** —італа-французс фільм з удзелам Стэфаніі Сан рэлі і Фані Ардан аб каханн нянавісці. Зноў на экране цуд ўная пародыя на амерыкан вестэрн »Ліманадны Дж

Юрыдычная даведка

# З КЛОПАТАМ ПРА МАЦІ І ДЗІЦЯ

Вярхоўны Савет нашай рэспублікі падрыхтаваў жанчынам да іх свята прыемны падарунак. 5 лютага 1991 года была прынята Пастанова «Аб дадатковых мерах па паляпшэнню аховы мацярынства і дзяцінства ў Беларускай ССР», згодна з якой з 1 сакавіка 1991 года павялічана працягласць часткова аплачваемага водпуску па дагляду за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў.

Маці дзіцяці або іншыя члены сям'і, якія фактычна здзяйсняюць дагляд за ім, можа браць гэты водпуск адразу ўвесь або часткамі.

Асобам, якія знаходзяцца ў водпуску па дагляду за дзіцём ва ўзросце ад паўтара да трох гадоў, устаноўлена штомесячная дапамога ў размеры мінімальнай заработнай платы (70 руб.). Аднак, гэта дапамога будзе выплачвацца пры ўмове, што дзіця не аформлена ў дзіцячую дашкольную ўстанову.

У тым выпадку, калі на дзіця ўстаноўлена дапамога ў размеры 50 працэнтаў мінімальнай заработнай платы (35 руб.)згодна з пастановай Савета Міністраў СССР ад 2 жніўня 1990 г. № 759, то выплата штомесячнай дапамогі асобам, якія знаходзяцца ў водпуску па дагляду за дзіцём ва ўзросце ад паўтара да трох гадоў, праводзіцца з улікам гэтай сумы.

Маці, іншыя члены сям'і, якія фактычна даглядаюць за дзіцём, у час знаходжання ў гэтым водпуску пры жаданні могуць працаваць на ўмовах няпоўнага працоўнага дня ці дома з захаваннем права на атрыманне дапамогі.

Акрамя таго, мясцовым Саветам народных дэпутатаў даручана вырашыць пытанне аб льготным абслугоўванні маці, якая мае дзіця ва ўзросце да паўтара года і жанчын з 12-ці тыднёвага тэрміну цяжарнасці неабходнай колькасцю прадуктаў для паўнацэннага збалансаванага харчавання праз сталы заказаў для інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

**А. БЕЛАВУСАЎ, юрысконсульт пры ГрДзУ.**

# О, ЖАНЧЫНЫ!

**Жалеза саграе.**

Жанчыны часта мерзнуць. Эксперымент, які правялі амерыканскія вучоныя, паказаў, што прычына ў недахопе жалеза, якое скарыстоўваюць у ежы. У жаночым арганізме яго звычайна менш, чым у мужчынскім.

**Руку прапануе жанчына.**

Недалёка ад гарадка Імілхінь на беразе возера, каля Атласкіх гор, штогод праходзіць незвычайны кірмаш жаніхоў. Жанчыны плямені айт-хадзіду, якія тут жывуць, могуць выбраць спадарожніка жыцця.

**Пагаварым на «жаночай мове»!**

Яна захавана да нашых дзён. Не, гэта не тая гаворка, якой жанчыны карыстаюцца ў чэргах і цырульнях. Гэта сапраўдная мова, якую прадстаўніцы цудоўнай паловы чалавецтва выкарыстоўваюць толькі ў размовах паміж сабой, і толькі яны могуць яе зразумець.

У Паўночнай Амерыцы ў раёне Місісіпі еўрапейцы засталі племя індзейцаў натчы. Акрамя агульнай мовы, на якой размаўляла ўсё племя, у жанчын існавала свая мова або жаргон.

Многія этнографы лічаць, што асобныя жаночыя мовы, якія яны старанна захоўваюць ад чужых,— памяць пра тайныя союзы жанчын, якія змагаліся супраць улады мужчын.

# МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ Ў ПРЫКАЗКАХ

Прыказкі адлюстроўваюць законы народнага жыцця. «Прыказкі — гэта народы»,— гаварыў Гётэ. І тое, што знаходзіцца ў скарбніцы іншага народа, заўсёды прыцягвае ўвагу. У кожнага народа ёсць шмат прыказак, прысвечаных каханню, адносінам паміж мужчынай і жанчынай.

**Іспанскія прыказкі.**

Служи своему мужу как повелителю и остерегайся его как предателя!

* * *

Любовь женщины узнают по одежде ее мужа.

* * *

Кто ни разу не брал иголку в руки, не сможет оценить свою цветов.

* * *

Упрямой жене ослабь веревку.

* * *

Женщина и курица стареют от беготни.

**Нямецкія прыказкі**

Жены делают из пфеннигов — талеры, мужчины из талеров — пфенниги.

* * *

Оставьте женщинам и детям их игрушки!

* * *

Без женщин нет радости.

* * *

Муж должен все есть, но не все знать.

* * *

Где не хватает разумных мужей, повышаются в цене дураки.

* * *

Чем меньше приказывает жена, тем больше ее слушает муж.

**Французскія прыказкі.**

Чтобы в семье были мир и тишина, муж должен быть глух, а жена слепа.

* * *

Женщина смеется, когда хочет, и плачет, когда может.

* * *

Что хочет женщина, то хочет Бог.

* * *

Милости, женщины и деньги превращают невежд в кавалеЖенщин, как и лошадей, безупречных не бывает.

* * *

Дом без женщины — тело без души.

**Рускія прыказкі.**

Баба с печи летит, семьдесят семь дум передумает.

* * *

Где черт не сладит, туда бабу пошлет.

* * *

Мужик без бабы, пуще малых деток сирота.

* * *

Баба побабит, все дело поправит.

* * *

Муж с женой, что мука с водой.

* * *

# Новая партыя

Ва універсітэце адбыўся арганізацыйны сход новай палітычнай партыі Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада. На сходзе створана універсітэцкая суполка партыі, старшынёй абраны старшы выкладчык кафедры замежных моваў М. С. Патрэба.

БСДГ кіруецца задачаю ажыццяўляць сапраўднае народа — ўладдзе, сацыяльную справядлівасць, дзяржаўную незалежнасць Беларускай рэспублікі. Партыя дзейнічае згодна з Канстытуцыяй БССР дэмакратычнымі метадамі, адмаўляючы прымус і гвалт як сродкі дасягнення пастаўленых мэт, супрацоўнічае з усімі дэмакратычнымі партыямі і аб ´яднаннямі на прынцыпах роўнасці. БСДГ абапіраецца на гістарычную традыцыю, ля вытокаў якой — першая беларуская палітычная партыя Беларуская Сацыялістычная Грамада, заснаваная ў 1903 годзе такімі выдатнымі нацыянальнымі дзеячамі, як Антон Луцкевіч, Іван Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Цётка, Карусь Каганец, Аляксандр Уласаў, Алесь Бурбліс і інш. Пасля расколу БСГ у 1918 годзе, калі была ўтворана Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Партыя, яе лідэрамі сталі Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Антон Луцкевіч, Алесь Гарун, Язэп Лёсік, Аркадзь Смоліч. З гэтымі імёнамі звязаны лепшыя здабыткі нашай вызваленчай барацьбы і культурнага руху, якія БСДГ імкнецца памнажаць і развіваць.

Статут беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» за 1 лютага 1991 года.

**А. ПЯТКЕВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускай культуры.**

# МЕДЫЦЫНА І СТУДЭНТЫ

У студзені гэтага года ў г. Мінску адбывалася рэспубліканская вучэбна-метадычная канферэнцыя, прысвечаная пытанням выкладання медыцынскіх дысцыплін і грамадзянскай абароны ў ВНУ.

Што датычыць грамадзянскай абароны, то гэты прадмет, як вядома, у вышэйшых навучальных установах педагагічнага і гуманітарнага профіляў скасоўваецца. Усе студэнты (хлопцы і дзяўчаты) будуць вывучаць прадметы, прадугледжаныя праграмай медыцынскай падрыхтоўкі.

Трэба адзначыць, што і сам гэты курс вельмі істотна змяняецца ў выніку ўвядзення дадатковых раздзелаў, такіх як «Мацярынства і ахова здароўя дзяцей» (педагагічныя факультэты) і «Здаровы лад жыцця» (гуманітарны профіль).

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел запрошаныя студэнты ВНУ рэспублікі.

У прамовах выступаючых была падкрэслена асаблівая важнасць значэння курса ў вучэбных праграмах вышэйшых навучальных устаноў. Кожны інтэлігентны чалавек павінен быць усебакова развітым. Так, у Злучаных Штатах Амерыкі на медыцыну адводзіцца больш за 700 гадзін, а у нас прадугледжана ўсяго толькі 238 гадзін.

Было падкрэслена: медыцына ў нас павінна мець не ваенны накірунак, а хіліцца ў траўматалагічны і педагагічны бок. Трэба больш дасканала вывучаць асаблівасці дзіцячай гігіены і дзіцячых захворванняў. У прамовах прыводзілася шмат прыкладаў, калі з-за недарэчных дзеянняў людзей пры ратаванні, стан пацярпеўшых моцна пагоршваўся. Падкрэслівалася, што кожны чалавек у першую чаргу павінен умець аказаць дапамогу ў самых экстрымальных сітуацыях.

У абмеркаванні розных аспектаў падрыхтоўкі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі прынялі ўдзел загадчык кафедры «Асноў медыцынскіх ведаў і аховы здароўя дзяцей нашага універсітэта А. У. Меляшэвіч і аўтар гэтага артыкула.

**Р. КАЗЛОЎСКІ,**
**студэнт 3 курса філфака.**

# «СТРАЎНІК ЛЮБІЦЬ РЫТМ, МАДАМ...»

У сярэдневяковай Італіі музыка была адзіным сродкам супраць дзіўнай хваробы — так званага «тарэнтызму». Хвароба гэта прыпісвалася укусу ядавітага павука тарантула, але хутчэй за ўсё гэта была разнастайнасць псіхічнай эпідэміі. Людзі, калі упэўніваліся, што цела іх атручана ядам павука, упадалі ў самоту. Тысячы вандроўных прапаноўвалі паслугі ахвярам тарантула. Пры гуках музыкі хворыя станавіліся жвавымі, расплюшчвалі вочы і пачыналі рухацца ў такт мелодыі. Музыканты ўзмацнялі тэмп, даводзячы хворых да шалёных сутаргавых скокаў — хвароба «вытанцоўвалася», і яд знікаў. У народнай мурдасці застаўся з тых часоў хуткі танец — тарантэла.

Тры музыканты дапамаглі прынцу Аранскаму выратавацца ад зацяжнай меланхоліі. Знакаміты спявак Фарынелі карыстаўся вялікім уплывам пры іспанскім двары толькі таму, што выратаваў караля Філіпа У ад безнадзейнага іпахандрычнага стану. Англійскага філосафа Спенсера і прем ´ера Гладстана музыка пазбавілася неўралгічных боляў, Байрана — растройства стрававання.

УХУІІ і асабліва у ХУІІІ стагоддзі музычнае выкарыстанне было модным у салоннай медыцыне Еўропы. Вялікасвецкія эскулапы раілі сваім пацыентам прымаць ежу пад стук барабанаў: «Страўнік любіць рытм, мадам...»

У ЗША створана Нацыянальная асацыяцыя музык «тэрапеўтаў», якія складаюць лячэбныя каталогі музыкі. Яны прапануюць, у прыватнасці: для памяншэння раздражнення: Бах, Кантата № 2; Бетховен, «Лунная саната»; Пракоф ´еў, Саната ў «рэ»; Франк, Сімфонія рэ-мінор;

— як танізіруючы сродак: Бах, Прэлюдыя і фуга рэ-мінор; Бетховен, уверцюра «Эгмонт»; Чайкоўскі, Шостая сімфонія, 3 частка; Шапэн, Прэлюдыя Ор. 28, № 1; Ліст, Венгерская рапсодыя № 2.

— супраць рэўнасці і падазронасці: Бах, Кантата № 21, Шапэн, Накцюрн рэ-мінор, Равель, Квартэт у «фа»;

— супраць хранічнай злосці: Бах, Італьянскі канцэрт; Гайдн, Сімфонія, Сібеліус, «Фінляндыя»;

— супраць галаўнога болю: Бетховен, «Фідэліо»; Моцарт, «Дон Жуан»; Ліст, Венгерская рапсодыя № 1; Хачатуран, «Маскарад»;

— у час харчавання: Равель, Вальс; Ліст, Канцэрт № 2.

# ДЫЯГНАЗ... ЗА ПАЎГАДЗІНЫ



Супрацоўнікам універсітэта, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, агульным умацаванні арганізму і лячэнні сваіх наяўных і скрытых хвароб, будзе аказана кваліфікаваная дапамога ўрачамі І-й гарадской паліклінікі і спецыялістамі Гродзенскага медыцынскага інстытута.

Па ініцыятыве прафсаюзнага камітэта універсітэта сумесна з адміністрацыяй арганізаваны кабінет урачэбнага прыёму супрацоўнікаў універсітэта.

Прыём будзе весці цэхавы ўрач-тэрапеўт Дубкова Кацярына Андрэеўна. Яна забяспечвае выяўленне захворванняў, іх своечасовую дыягностыку, і кваліфікаванае лячэнне хворых, праводзіць прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджванню і зніжэнні захворванняў з часовай стратай працаздольнасці, здзяйсняе дыспансерызацыю супрацоўнікаў, перыядычныя медыцынскія агляды асоб, звязаных з прафесіянальнай шкоднасцю, даглядае за санітарна-эпідэміялагічным рэжымам і ўмовамі працы супрацоўнікаў.

Кабінет урачэбнага прыёму адкрыты на базе 1-ай гарадской паліклінікі, якая размешчана на вуліцы Лермантава, 13, кабінет № 410, 4 паверх.

У паліклініцы ёсць спецыялізаваныя кабінеты, у якіх працуюць урачы-спецыялісты (кардыёлаг, гастраэнтэролаг і інш.). Яны па меры неабходнасці будуць здзяйсняць кансультацыі, ёсць таксама і клініка-дыягнастычная лабараторыя, рэнтгеналагічнае аддзяленне, кабінеты функцыянальнай дыягностыкі. Гэта дазволіць больш поўна і своечасова абследаваць нашых пацыентаў.

Усе свае заўвагі і прапановы па рабоце ўрача вы можаце накіроўваць у адміністрацыю паліклінікі № 1, а таксама ў прафсаюзны камітэт універсітэта.

Даведка. Дубкова Кацярына Андрэеўна ў 1983 годзе скончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут. Пасля вучобы ў інстытуце праходзіла інтэрнатуру ў г. Гомелі, працуючы ўрачом-эндакрыналагам у гарадской паліклініцы № 2. З 1990 года жыве ў г. Гродне. Мае ІІ кваліфікацыйную катэгорыю ўрача тэрапеўта.

# Прыміце нашы віншаванні

Дарагія, мілыя, абаяльныя жанчыны!

Прыйшло, нарэшце, свята вясны і маладосці, калі хочацца нізка скланіцца перад Вашай дабрынёй і ласкай, сардэчнасцю і шчырасцю, перад Вашай пяшчотнасцю.

Сення ўсе нашыя цёплыя словы падзякі мы адрасуем Вам. Дзякуй Вам за тое, што Вы разам з намі дзеліце ўсе нашы радасці, смутак і мужчынскія абавязкі ў выхаванні, фарміраванні і станаўленні студэнтаў універсітэта. Дзякуй Вам за вашу падтрымку, за вашу ўвагу, за вашу цеплыню і ласку!

Жыццё на гэтай зямлі з часоў Евы і Адама склалася так, што ўсё цудоўнае ў ім ідзе ад Вас — дарагія нашы жанчыны! Ваша мацярынская ласка, дабрыня і любоў саграваюць нашу зямлю, дораць ёй бессмяротнасць.

Ад шчырага сэрца віншуем Вас са святам! Моцнага Вам здароўя, шчасця, міру, вечнай маладосці, моцнага кахання ў кожнай вашай сям ´і.

**У. ХІЛЮТА.**

* * *

Дарагія жанчыны! Спартыўны клуб універсітэта віншуе вас з Днём Вясны — 8 Сакавіка. Жадаем вам у гэты дзень сапраўднага свята. Забудзьце пра ўсе нягоды, трывогі нашага сённяшняга дня. Няхай вашымі спадарожнікамі будуць у гэты дзень кветкі, усмешкі, увага і каханне.

**І. БЕЛАОКІ,**
**старшыня спартклуба.**

**Парады ўрача**

# ПРАФІЛАКТЫКА ГРЫПУ

З наступленнем халодных і дажджлівых дзён пачынаецца рост прастудных захворванняў. У гэты перыяд на іх фоне ўзнікаюць успышкі грыпу. Восень і першы месяц зімы ў вобласці характарызаваліся звычайным неэпідэмічным пад ´ёмам вострых рэспіраторных захворванняў, грып не рэгістраваўся. Паводле паведамлення Усесаюзнага цэнтра па грыпу, найбольш магчыма распаўсюджванне грыпу А. Перш за ўсё ён пагражае дзецям і падлеткам. Не з ´яўляецца выключэннем, што да віруса А можа далучыцца і вірус Б.

На «долю» грыпу і вострых рэспіраторных захворванняў прыходзіцца больш, чым 90% усіх выпадкаў інфекцыйных захворванняў.

Між тым, не ўсе людзі адносяцца да грыпу з адказнасцю, якой ён заслугоўвае, многія выхваляюцца сваёй «мужнасцю» і з тэмпературай, кашлем ідуць на работу. Маўляў, няма калі хварэць. Рэдка ў перыяд масавых захворванняў можна ўбачыць у кватэрах, на вытворчасці людзей у марлевых павязках. У выніку праяўлення гэтай масавай няўвагі да акружаючых, эпідэмія грыпу захоплівае цэлыя гарады, вобласці. Крыніцай інфекцыі з ´яўляецца хворы чалавек, які пры кашлі, чыханні, выдзяляе з драбнейшымі кропелькамі макроты і слюны вірусы грыпу. Такі паветрана-капельны шлях перадачы інфекцыі садзейнічае яе хуткаму распаўсюджванню.

Грып і яго ўскладненні ангіны, запаленні лёгкіх, сярэдняга вуха могуць значна падарваць здароўе. Пад уздзеяннем грыпу могуць абвастрыцца хранічныя захворванні сэрца і сасудаў, нярвовай сістэмы, рэўматызму, туберкулёзу.

Праяўленне кашлю, лёгкіх дрыжыкаў заўсёды павінна ўспрымацца як востры сігнал аб бяспецы не толькі для хворага, але і для ўсіх акружаючых — сям ´і, суседзяў, працоўнага калектыву. Толькі ўрач можа назначыць правільнае лячэнне. Таму своечасовы зварот да ўрача мае важнае значэнне для людзей любога ўзросту, асабліва для дзяцей, у якіх грып выклікае ўскладненні.

Ні ў якім разе нельга займацца самалячэннем.

Пры першых прыкметах захворвання хворага трэба ізаляваць у асобны пакой ці адгарадзіць яго ложак шырмай. Выдзяліць хвораму асобны посуд, ручнік. Памяшканне трэба праветрываць 3-4 разы ў дзень, не менш 30 хвілін. Свежае паветра згубна дзейнічае на вірус. Хвораму пры чыханні і кашлі трэба прыкрываць рот насавой хустачкай. Прыбіраць памяшканне рэкамендуецца вільготным спосабам, выкарыстоўваючы раствор хлараміну (1 ст. лыжка парашка на вядро вады).

У перыяд успышкі грыпу трэба пазбягаць наведвання магазінаў, кінатэатраў, іншых месц, дзе збіраецца шмат людзей, радзей карыстацца грамадскім транспартам.

Для індывідуальнай прафілактыкі грыпу можна прымяняць рэмантадзін (па 1 табл. 1 раз у дзень для дарослых на працягу 20-30 дзён), аксалінавую, цэабрафенавую мазь, (наносіцца на слізістую абалонку носа) лейкацытарны інтэрферон (закапваецца ці распыляецца ў нос 3 разы ў дзень па 3-4 кроплі).

У дзіцячых дашкольных установах у халодны сезон года рэкамендуецца прымяняць сіроп з пладоў па 1 чайнай лыжцы ў дзень. Надзейным саюзнікам у барацьбе з грыпам з ´яўляецца вітамін «С», які ў перыяд максімальнага пад ´ёму захворвання прымяняюць з мэтай прафілактыкі па 0,5 г на працягу 10-20 дзён.

Агульнаўмацоўваючай і танізуючай уласцівасцю, павышаючай неспецыфічную рэзісценнасць арганізма, валодае экстракт элексцеракока, прымяняецца ў выглядзе 25-30 дзённых курсаў дзецям — па 1 кроплі на год жыцця два разы ў дзень.

У найкарацейшыя тэрміны неабходна ўкараніць ва ўсіх дашкольных дзіцячых установах, школах, прамысловых прадпрыемствах указаныя вышэй і іншыя метады неспецыфічнай прафілактыкі грыпу, уключаючы вітамінізацыю харчу на прадпрыемствах грамадскага харчавання. Для прафілактыкі грыпу таксама карысная цыбуля, часнок настой зялёнага чаю. Маюць вялікае значэнне і калектыўныя меры барацьбы з грыпам — кантроль за чысцінёй паветра ў рабочых памяшканнях, сістэматычнае праветрыванне, добрая вентыляцыя.

І ўсё ж самым эфектыўным сродкам прафілактыкі грыпу з ´яўляецца закальванне арганізма. Асабліва яно неабходнае дзецям. Калі дзіця прывучана знаходзіцца на свежым паветры ў любую пару года, апранута заўсёды па сезону, то яно менш падвяргаецца прастудзе, радзей хварэе або лягчэй яго пераносіць.

Прагулка на свежым паветры, вільготнае абціранне, заняткі фізкультурай, плаваннем, сонечныя ванны павышаюць супраціўленне арганізма інфекцыям.

Грып наносіць вялікі ўрон не толькі здароўю людзей, але і народнай гаспадарцы, суправаджаецца дзесяткамі і сотнямі мільёнаў патрачаных рабочых дзён, таму барацьба з грыпам — агульнанародная справа.

**А. КІРЭЕВА,**
**урач-эпідэміёлаг Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі**

# СПАЗНАЕМ СЯБЕ

Кажуць, што рэчы гавораць пра свайго гаспадара. Ну што ж, давайце паглядзім, што скажа пра вас ваша губная памада.

Ваша памада доўга захоўвае трошкі завостраную форму. Гэта гаворыць, што вы чалавек практычны і салідны. Заўсёды ведаеце, чаго хочаце і чаго вам не хапае. Не любіце затрачваць сябе на дробязі.

Верх памады раўнамерна закруглены: вы жанчына мэтанакіраваная, дастаткова спакойная, умееце пастаяць за сябе. Свае планы вы будуеце загадзя. Сваім поспехам абавязаны ў першую чаргу працалюбству і акуратнасці, адзінае, чаго вам не хапае, дык гэта пачуцця гумару.

Верх памады нейкай неакрэсленай формы. Гэта гаворыць аб тым, што вы неўраўнаважаны, любая дробязь можа выклікаць у вас хваляванне, аднак, вы хаваеце яго пад маскай самаўпэўненасці і энергіі. Да людзей адносіцеся з недаверам. Любіце вячэрнія прагулкі, прыгожыя рэчы. Адчуваеце цягу да сентыментальных раманаў.

Канец слупка завострaны, як аловак Гэта часта сведчыць аб эгаізме, любові да самасузірання. Жанчыны, у якіх памада такой формы, вызначаюцца ганарыстасцю, яны не прытрымліваюцца поглядаў іншых. Вы цяжка сходзіцеся з людзьмі, лічыце сябе ідэальнай жонкай.

Памада зверху плоска закруглена: вы аптымістка, не ведаеце што такое сум. Прамалінейныя, непасрэдныя ў адносінах з людзьмі, лёгка знаходзіце «агульную мову» з акружаючымі. Не звяртаеце ўвагі на жыццёвыя дробязі. Сваёй праматой часам можаце зняважыць чалавека, але не наўмысна.

Такая форма памады сустракаецца рэдка. Такі ж незвычайны і арыгінальны ваш характар. Вы чалавек настрою, парывісты, неўраўнаважаны, лёгка прыходзіце і да захаплення, і да адчаю, адным словам — поўныя супярэчнасцей. Як правіла, вы вясёлыя, ў кампаніі заўсёды ў цэнтры ўвагі. Але як таварыш, на жаль, ненадзейныя, можаце падвесці ў цяжкую хвіліну.

Слупок памады сцёрты з аднаго боку. Вы адносіцеся да жанчын з багатым уяўленнем, дастаткова дзелавыя, за словам у кішэнь не палезеце. Прадпрымальныя, але не заўсёды практычныя. Вызначаецеся тым, што не капрызнічаеце, а капрызы іншых пераносіце спакойна. У кампаніі жанчын адчуваеце сум. Маеце блізкую сяброўку, з якой дзеліцеся сваімі таямніцамі і якой многае даруеце.

Памада мае форму ўсечанага конуса. Мабыць, вы валодаеце спакойным, вясёлым характарам, задаволены сваім лёсам. Вельмі добра разбіраецеся ў людзях. Часам можаце зайздросціць іншым — гэта псуе ваш настрой.

# ВЕСНАВЫ НАСТРОЙ



*Жаночая прыгажосць!*

*Дзеля якой не хапае слоў, каб выказаць яе, не хапае гукаў, каб перадаць яе ў музыцы, не хапае фарбаў, каб паказаць яе ў мастацтве. А яна схавалася ў гэтым чароўных вачах, у гэтай мілай усмешцы, у гэтых ласкавых руках.*

*На конкурсе прыгажосці, што адбыўся ў нашым горадзе, званне Міс публікі і Віцэ-Міс атрымала АЛЕНА ШУЛЬГІНА. Алена працуе сястрой міласэрнасці, любіць спорт. А таксама любіць дапамагаць людзям. І яшчэ, магчыма, без яе і не было б групы сучаснага танца «Мадэрн».*

*Фота Ю. СМАЛЬ.*

# ЯК ХТО КАХАЕ

Кухарка — горача.
Цукернік — соладка.
Гімназіст — класічна.
Доктар — смяротна.
Ваенны — агніста.
Кааператар — супольна.
Журналіст — сенсацыйна.
Тэолаг — набожна.
Паэт — фантастычна.
Дурань — вечна.

# ФІРМЕННЫ РЭЦЭПТ

**(ЯК З ПРОЗЫ СЕННЯШНЯГА ЖЫЦЦЯ СТВАРЫЦЬ ПАЭЗІЮ)**

Вазьміце прозу жыцця, узбіце яе да пены эмоцый, пакладзіце па густу страсці, упрыгожце мінутным бяздумствам, атрымаецца паэзія пачуццяў.


# ВНИМАНИЕ!

*Готовится к выходу в свет первый выпуск ежемесячного приложения к газете «Молодежный курьер».*

*дайджест*

## *«В СВОБОДНЫЙ ВЕЧЕР»*

***«В свободный вечер»*** *— даст уроки и советы тем, кто желает мастерить, рукодельничать, готовить, строить, выращивать, ремонтировать и т. д.*

***«В свободный вечер»*** *— научит вас создавать своими руками красоту жизни, физически и духовно совершенствовать себя.*

***«В свободный вечер»*** *— поможет вам познакомиться с сенсационными, увлекательными и познавательными материалами, опубликованными в недоступных для гродненцев изданиях.*

*Цена ежемесячного приложения —50 коп.*

Покупайте дайджест **«В свободный вечер»** в киосках «Союзпечати».


# КЕЛІХ

**Прышпілі да сукенкі чырвоную ружу,**
**зазірні асцярожна ў крыштальны**
**сусвет.**
**Нехта там, мне здаецца, гуляе нясмела,**
**эратычныя хвалі палоняць яго.**
**Ён зусім непаўторны, як смешнае рэха, абалонка блакітна-зялёная, быццам ручай.**
**Смех цвярозы і п´яны трапляе, дзе**
**зорныя ўлады**
**нараджаюць нябачна сляпы маладзік.**
**І губляюцца недзе расліны і кветкі**
**ў тваім космасе чорным, нібы валасы**
**незнаёмай японкі. Але невядома**
**з якой кінастужкі яна прыплыла.**

***АНЖЭЛІНА ДАБРАВОЛЬСКАЯ***

**вецер часу**
**схіляе да кораня**
**... дрэва...**
**полымя**
**праглынае**
**... матыль...**
**з атручаных абразоў**
**вочы**
**... дзеці...**
**... Дзева Марыя...**
**дзе... Ты...**

***МІКОЛА КАСЬЦЮКЕВІЧ***

**Самотным рэхам срэбных струнаў,**
**Пралітых слёз пякучай соллю**
**Яшчэ бруіцца ў венах болем**
**Напаўзабытасць пацалункаў.**
**Галін пажоўклыя карункі**
**Паветра лашчыць беззаганна.**
**Ах лета цёплае кахання,**
**І ты астыла ў пацалунках.**

# АКРАВЕРШ

**Я не пранёс у жорсткім часе**
**Цнатлівасць, як вышэйшы дар.**
**Яна ў мяне даўно звялася,**
**Бо шмат каму прынёс ахвяр.**
**Енк не заплюшчыў мае вочы,**
**Калі сыходзіў ад цябе,**
**Але цяпер да самай ночы**
**Хаджу ў смутку і жальбе.**
**Адной табе належыць лёс**
**Юнацкіх выплаканых слёз.**


# ПОДПИСКА—91

Подписывайтесь на Гродненский общественно-политический еженедельник «МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР»!

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это репортажи, интервью, встречи с теми и о тех, кто интересует вас!

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это ответы на те вопросы, которые волнуют и тревожат молодых.

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это защита ваших прав и помощь в реализации ваших интересов в жизни!

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это практические советы медиков, социологов, юристов, деловых и мастеровых людей в организации учебного и рабочего процессов, установлении личных и деловых контактов.

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это ваш лоцман в море кинопрограмм, музыки, литературы и искусства, возможность высказать свое мнение, поспорить.

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это школа знакомств, поздравительная открытка сверстникам и новобрачным, разнообразная реклама, молодежный гороскоп и игротека!

«МОЛОДЕЖНЫЙ КУРЬЕР» — это газета молодых, о молодых и для молодых!

Подписку принимают в городских, областных агентствах «Союзпечати» и комитетах комсомола. Телефон для справок: 45-31-82; 45-38-83.

Стоимость подписки: с апреля до конца года (9 мес.) — 5 руб. 40 коп., на 6 мес. — 3 руб. 60 коп.

**Наш почтовый индекс — 63924.**



Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 1540 т. 2000

**В. а. рэдактара С. М. ЛАЎНІК**